УДК 94(476).083

# ШЛЯХІ ІНТЭНСІФІКАЦЫІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ НА МЯЖЫ XIX–XX стст. (па матэрыялах перыядычнага друку)

*М. М. ЗАБАЎСКІ*[1*], *А. П. ЦУМАРАВА*[2*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, вул. Савецкая, 18, 220050, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
[2*]*Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, пр. Міру, 43, 212030, г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь*

Даследуецца дзейнасць сельскагаспадарчых таварыстваў па інтэнсіфікацыі вытворчасці ў галінах аграноміі, жывёлагадоўлі, конегадоўлі, садоўніцтва; паляпшэнні быту сельскага насельніцтва ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Вывучаны прапановы па развіцці ўзроўню гаспадарання ў Беларусі на прыкладзе дзейнасці Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Паказана прагрэсіўнае ўздзеянне вопытных аграномічных устаноў: станцый, палёў і даследчых гаспадарак. Прааналізавана грамадская думка пра перавагу развіцця вопытных ферм, дэманстратыўных устаноў і гаспадарак, вынікі працы якіх мелі прыкладное значэнне. На прыкладзе працы Мар'іна-Горскай сельскагаспадарчай школы разгледжана роля ўстаноў падобнага тыпу як цэнтраў наватарства для сялянскіх і памешчыцкіх сельскіх гаспадарак пэўнай мясцовасці. Асаблівая ўвага нададзена правядзенню сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выставы ў Мінску ў 1901 г., якая стала паказчыкам дасягненняў у сельскай гаспадарцы і фактарам укаранення інтэнсіўных метадаў у сельскагаспадарчую вытворчасць беларускіх губерняў.

***Ключавыя словы:*** інтэнсіфікацыя; Беларусь; Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі; дэманстрацыйнае поле; выстава; павышэнне выніковасці.

# ПУТИ ИНТЕНСИФИКАЦИИ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ПРОИЗВОДСТВА В БЕЛАРУСИ НА РУБЕЖЕ XIX–XX вв. (по материалам периодической печати)

*Н. М. ЗАБАВСКИЙ*[1)], *Е. П. ЦУМАРЕВА*[2)]

[1)]*Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка, ул. Советская, 18, 220050, г. Минск, Республика Беларусь*
[2)]*Белорусско-Российский университет, пр. Мира, 43, 212030, г. Могилёв, Республика Беларусь*

Исследуется деятельность сельскохозяйственных товариществ по интенсификации производства в отраслях агрономии, животноводства, коневодства, садоводства; улучшению быта сельского населения в Беларуси в конце XIX – начале XX в. Изучены предложения по развитию уровня хозяйствования в Беларуси на примере деятельности Минского общества сельского хозяйства. Показано прогрессивное воздействие опытных агрономических учреждений: станций, полей и исследовательских хозяйств. Проанализировано общественное мнение о предпочтении развития

**Образец цитирования:**
Забаўскі М. М., Цумарава А. П. Шляхі інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў Беларусі на мяжы XIX–XX стст. (па матэрыялах перыядычнага друку) // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2017. № 1. С. 17–24.

**For citation:**
Zabauski M. M., Tsumarava A. P. The ways of intensification of agricultural production in Belarus in the late XIX and early XX centuries (according to the materials of periodical press). *J. Belarus. State Univ. Hist. Sci.* 2017. No. 1. P. 17–24 (in Belarus.).

**Авторы:**
***Николай Михайлович Забавский*** – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры истории Беларуси и славянских народов исторического факультета.
***Елена Петровна Цумарева*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры гуманитарных дисциплин.

**Authors:**
***Mikalaj Zabauski***, doctor of science (history), full professor; professor at the department of history of Belarus and Slavic peoples, faculty of history.
*zabavskij@tut.by*
***Alena Tsumarava***, PhD (history), docent; associate professor at the department of humanities.
*ilmazum@tut.by*

опытных ферм, демонстративных учреждений и хозяйств, результаты работы которых имели прикладное значение. На примере работы Марьино-Горской сельскохозяйственной школы рассмотрена роль учреждений подобного типа как центров новаторства для крестьянских и помещичьих сельских хозяйств определенной местности. Особое внимание уделено проведению сельскохозяйственной и кустарно-промышленной выставки в Минске в 1901 г., являвшейся показателем достижений в сельском хозяйстве и фактором внедрения интенсивных методов в сельскохозяйственное производство белорусских губерний.

***Ключевые слова:*** интенсификация; Беларусь; Минское общество сельского хозяйства; опытное поле; выставка; увеличение результативности.

# THE WAYS OF INTENSIFICATION OF AGRICULTURAL PRODUCTION IN BELARUS IN THE LATE XIX AND EARLY XX CENTURIES (according to the materials of periodical press)

***M. M. ZABAUSKI***[a]***, A. P. TSUMARAVA***[b]

[a]*Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University, Sovetskaya street, 18, 220050, Minsk, Republic of Belarus*
[b]*Belarusian-Russian University, Mira avenue, 43, 212030, Mogilyov, Republic of Belarus*

*Corresponding author: zabavskij@tut.by*

This article explores the activities of agricultural communities for development of intensification in the fields of agronomy, animal farming, horse breeding, gardening and for improvement of farmers' living in Belarus in the late XIX and early XX centuries. The author studied the proposals for development of the level of husbandry in Belarus on the example of activities of Minsk Agricultural Society. The article reveals the progressive influence of the activity of agronomic practice institutions: stations, fields and research farms. It analyzes the public opinion on the preference of developing experimental farms, demonstrative institutions and farms, the results of which had practical importance. The example of Marjino-Gorskaya Agricultural School displays the role of agricultural schools as innovation centers for peasant and landlord farms on a particular territory. The author explored the realization of the agricultural and handicraft exhibition in Minsk in 1901 which was the indicator of progress in agriculture and a factor of introduction of intensive methods of farming into agricultural production in Belarusian provinces.

***Key words:*** intensification; Belarus; Minsk society of agriculture; demonstration field; exhibition; performance increase.

## Уводзіны

Паводле ацэнак сучасных даследчыкаў, сельская гаспадарка да рэформ сярэдзіны XIX ст. была «загнанай галіной», мела патрэбу ў тэхнічным перааснашчэнні, цярпела ад недахопу адпаведных ведаў і самадзейнасці гаспадароў. Палітычны дзеяч Г. І. Свяніцкі патрабаваў паменшыць дзяржаўную апеку, якая «пазбаўляла і пазбаўляе свабоды эканамічнага і прававога жыцця сялянскае саслоўе»[1], зводзячы да нуля рэформу 1861 г. [1, с. 13]. На гэтыя «ўнутраныя хваробы» было прапанавана звярнуць сур'ёзную ўвагу.

З нарошчваннем тэмпаў развіцця капіталістычнай таварнай вытворчасці ў XIX–XX стст., паглыбленнем грамадскага падзелу працы сельская гаспадарка павінна была не толькі забяспечваць прадуктамі харчавання насельніцтва, але і стаць крыніцай сыравіны для многіх галін прамысловасці. Рост колькасці сялянскіх жыхароў значна паскорыўся, і ў канцы XIX ст. на іх долю прыпадала больш за 3/4 народанасельніцтва. Толькі ў Мінскай губерні яно складала 71,8 %. Сялянская гаспадарка ўцягвалася ў рыначныя сувязі, што было немагчыма без інтэнсіфікацыі вытворчасці [2, с. 132, 181].

Пад інтэнсіфікацыяй разумеецца працэс узмацнення, павелічэння прадукцыйнасці дзейнасці [3]. У сельскай гаспадарцы інтэнсіфікацыя праяўляецца ў такіх паказчыках, як рост вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў разліку на адзінку зямельнай плошчы (галаву жывёлы) на аснове прымянення больш дасканалых сродкаў і метадаў вытворчасці – механізацыі, хімізацыі сельскай гаспадаркі, меліярацыі, аграрна-прамысловай інтэграцыі, укаранення дасягненняў навукі, перадавога вопыту. Інтэнсіфікацыя заснавана на рацыянальным выкарыстанні матэрыяльных і працоўных рэсурсаў пры вырошчванні сельскагаспадарчых культур і развядзенні жывёл, а таксама ў галіне першаснай перапрацоўкі прадуктаў.

Мэта нашага артыкула – паказаць праявы інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці на тэрыторыі Беларусі, якія знайшлі адлюстраванне на старонках перыядычных выданняў пачатку XX ст.

[1] Тут і далей пераклад наш. – *М. З., А. Ц.*

## Матэрыялы і метады даследавання

У пачатку XX ст. працягваўся працэс фарміравання грамадска-дзяржаўнай свядомасці народаў еўрапейскай цывілізацыі, у тым ліку і беларусаў. Як прадстаўнікі агульнаславянскай супольнасці, беларускія эліты імкнуліся выпрацаваць разуменне нацыянальнага гістарычнага шляху, які заключаўся ва ўсведамленні народам уласнай этнакультурнай і эканамічнай індывідуальнасці.

Каб наблізіцца да аб’ектыўнасці ў працэсе гістарычнага пазнання, неабходна зыходзіць з асноўных дасягненняў розных метадалагічных школ і сучаснага стану гістарычнай навукі. Агульныя крытэрыі аналізу матэрыялу могуць быць рэалізаваны праз сукупнасць такіх прынцыпаў, як аб’ектыўнасць, гістарызм і каштоўнасны падыход. Першы прынцып заснаваны на зборы, сістэматызацыі і аналізе канкрэтнага фактычнага матэрыялу, пачарпнутага з разнастайных крыніц. Верыфікаванасць навуковых высноў базіруецца на іх параўнанні з вынікамі як папярэдніх, так і сучасных даследаванняў.

Крыніцамі вывучэння сталі перыядычныя выданні пачатку XX ст. Газеты і часопісы ў гэты час адыгрывалі першарадную ролю ў асвятленні рэформ і палітычных дыскусій, былі асноўным сродкам масавай інфармацыі. Артыкул грунтуецца на аналізе матэрыялаў газет «Минский листок», «Белорусский Вестник», «Могилёвские губернские ведомости», «Kurjer Litewski».

Прымяненне метадаў крытычнага дыскурс-аналізу, кантэнт-аналізу тэкстаў дазволіла выявіць асноўную праблематыку і раскрыць спецыфіку адлюстравання ў грамадскай думцы праблем інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі беларускіх губерняў, вызначыць семантыку вобразнага ўяўлення аб шляхах і значэнні інтэнсіфікацыі.

## Абмеркаванні

У савецкай гістарыяграфіі асноўная ўвага надавалася вывучэнню такіх праяў інтэнсіфікацыі ў сельскай гаспадарцы, як спецыялізацыя вытворчасці, рыначныя сувязі, кааперацыя [4–6]. Даследчык Л. П. Ліпінскі прыйшоў да высновы аб тым, што выкарыстанне машын у памешчыцкай гаспадарцы, развіццё гандлёвага земляробства і ляснога гандлю, прамысловага прадпрымальніцтва сведчаць пра эвалюцыю капіталістычных адносін [5]. Рынак сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі разгледжаны як складальнік сусветнага аграрнага рынку.

Распрацоўка праблем інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі XIX – пачатаку XX ст. праведзена ў комплекснай працы беларускіх навукоўцаў «Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён» [2]. Пры даследаванні аграрна-сялянскага пытання ў грамадска-палітычнай думцы аўтары адзначылі, што толькі ліквідацыя панскага землеўладання і рэшткаў прыгонніцтва адкрывала дарогу для развіцця капіталізму, мадэрнізацыі, інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці [2, с. 247]. Да поспехаў капіталізму ў сялянскай гаспадарцы аднесены пастаўкі на ўнутраны і знешнія рынкі Расіі значнай колькасці збожжа, лёну, ільнянога семя [2, с. 177, 182].

Капіталістычны прагрэс у памешчыцкай гаспадарцы даследаваў А. П. Жытко. Аўтар прыйшоў да высновы аб тым, што выкарыстанне палепшаных прылад працы ў памешчыцкай гаспадарцы Беларусі даходзіла да 54–86 % к сярэдзіне 1890-х гг. Беларусь па гэтых паказчыках знаходзілася на другім месцы пасля Наваросіі. Развіццё капіталізму вымушала пераходзіць да шматпольнай сістэмы, якая ў памешчыкаў Мінскай губерні практыкавалася ў форме чатырох- і васьміпольных севазваротаў [7, с. 3].

Арганізацыі выстаў, у тым ліку і тых, дзе экспанавалася сельскагаспадарчая прадукцыя, прысвечана дысертацыйнае даследаванне А. Л. Кіштымава [8]. Аўтар разглядаў выставы як частку сусветнага мадэрнізацыйнага працэсу, а іх правядзенне ў Беларусі – як сведчанне развіцця беларускай гаспадаркі ў агульнаеўрапейскім кантэксце. Даследчыкам даказана лідарства Горы-Горацкага земляробчага вучылішча па актыўнасці на выставах і колькасці атрыманых на іх узнагарод. Адзначана, што ўдзел прадстаўнікоў Беларусі ў міжнародных экспертных камісіях сведчыў аб прызнанні іх досведу ў пэўных галінах. Аўтар прыйшоў да высновы аб першаснай ролі выстаў у прапагандзе навукова-тэхнічнага прагрэсу, дэманстрацыі навінак навукі і тэхнікі, выкарыстанні аграрна-навуковых ведаў на практыцы [8, с. 4–16].

Функцыянаванню вопытных станцый і палёў, вучэбных ферм на тэрыторыі Беларусі прысвечана дысертацыйнае даследаванне Т. М. Марчанка [9]. Асноўную ўвагу аўтар надала вывучэнню праблемы прафесійнай сельскагаспадарчай адукацыі, дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў у гэтым напрамку, развіцця Горы-Горацкай земляробчай школы як цэнтра аграрнай адукацыі Расійскай імперыі [9, с. 4–5, 16].

Такім чынам, праблематыка інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці вывучана разнапланава. Аднак, на наш погляд, існуе патэнцыял даследавання тэмы па матэрыялах прэсы, у якіх знаходзілі адлюстраванне праекты інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі, дзейнасць адпаведных таварыстваў, працэсы арганізацыі выстаў, вопытных станцый і палёў у канцы XIX – пачатаку XX ст. Менавіта гэта дзейнасць шмат у чым прадвызначыла мадэрнізацыю сельскай гаспадаркі, распачатую С. Ю. Вітэ і працягнутую П. А. Сталыпіным. Некаторыя аспекты, прапанаваныя ў прэсе акрэсленага перыяду, не страцілі сваёй актуальнасці і сёння.

## Асноўная частка

У канцы XIX – пачатаку XX ст. цэнтрамі, якія распрацоўвалі новыя падыходы ў сельскагаспадарчай вытворчасці, з'яўляліся сельскагаспадарчыя таварыствы.

Сярод «значнага кантынгенту сельскіх гаспадароў» Беларусі, якія асабіста вялі свае справы, сфарміраваліся агульныя інтарэсы і патрэба ў арганізацыі «класавых устаноў» з мэтай ажыццяўлення «максімальна шырокай дапамогі краёвай гаспадарцы» [10]. Гэта патрэба ў грамадскай самадзейнасці была задаволена з адкрыццём 20 жніўня 1876 г. Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі (МТСГ), якое дало магчымасць беларускім гаспадарам «шляхам жывых зносін» разабрацца ў сваіх патрэбах [10].

Актыўнымі членамі МТСГ былі вядомыя грамадска-палітычныя лідары – Э. Вайніловіч, І. Друцкі-Любецкі, доктар З. Свянціцкі, Ф. Бохавіц, М. Ленскі, К. Абламовіч, М. Ваньковіч, В. Лазінскі. Членам-карэспандэнтам аддзялення ў Пінскім павеце з'яўляўся Р. Скірмунт. Работай па пастаўцы збожжа ў інтэнданцтва кіраваў А. Багдашэўскі, ён жа ўзначальваў бюро страхавання ад пажараў [11, с. 82–89].

У таварыстве дзейнічаў шэраг секцый па галінах сельскагаспадарчай вытворчасці, для ўтварэння якіх было неабходна 20 членаў.

Асноўным напрамкам дзейнасці па інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі з'яўлялася прымяненне навукова абгрунтаваных сістэм земляробства для павышэння ўрадлівасці глебы. З гэтай мэтай арганізоўваліся вопытныя агранамічныя ўстановы, упершыню распрацаваныя ў Эльзасе хімікам і аграномам Ж. Б. Бусенго ў 1835 г. Агранамічныя станцыі для беларускіх губерняў, як і для ўсёй Расійскай імперыі, былі параўнальна новай з'явай. Міністэрства земляробства аказвала матэрыяльную і юрыдычную дапамогу пры іх адкрыцці. Існавала два тыпы такіх устаноў: вопытныя станцыі і даследчыя палі, фермы і гаспадаркі [12].

Вопытныя станцыі з'яўляліся ўстановамі тэарэтычнага характару і займаліся навуковай распрацоўкай пытанняў сельскай гаспадаркі і яе асобных галін.

Даследчыя фермы, гаспадаркі – дэманстратыўныя ўстановы, якія мелі практычную накіраванасць: тут правяралі навуковыя высновы ў разнастайных прыродных, гістарычных і эканамічных умовах гаспадарання, высвятлялі рэнтабельнасць пэўных культур, укаранялі розныя мерапрыемствы непасрэдна на месцы прапаганды.

Вопытныя палі мелі вузкі мясцовы характар, але для сялян былі вельмі важныя, бо дэманстравалі ім наглядныя вынікі прымянення навуковых ведаў. Гэта выхаваўчае значэнне дасягала найвышэйшай ступені, калі вопытныя палі прымалі памеры даследчых гаспадарак, якія ўключалі ў сябе ўсе галіны сельскай вытворчасці пэўнай мясцовасці. Тут сяляне даследавалі сукупнасць развіцця сельскай гаспадаркі як асобнай самастойнай адзінкі. Уважлівы гаспадар вучыўся, да чаго ён павінен імкнуцца і чаго нельга рабіць [12].

МТСГ арганізоўвала правядзенне эксперыментаў на сялянскіх землях з мэтай нагляднай дэманстрацыі карысці штучных угнаенняў. Гэта павінна было паўплываць на фарміраванне ў сялян ведаў аб харчаванні раслін, навучыць іх новым прыёмам у гаспадаранні. Камісія атрымала ад вядомых замежных фірм калійныя ўгнаенні, томасшлак і сілікатныя ўгнаенні. У 1900 г. было праведзена 69 вопытаў: 47 – у Мінскай, 22 – у Віленскай і Ковенскай губернях [13, с. 3; 14].

Як адзначалася ў газеце «Беларускі веснік», для беларускіх губерняў асабліва карысным было распаўсюджванне вопытных ферм і гаспадарак, якія мелі прыкладное значэнне. Без іх шматлікія карысныя наваўвядзенні засталіся б у межах вопытных станцый, кабінетаў і лабараторый. Дэманстратыўныя ўстановы былі важнымі не толькі для ўдасканалення апрацоўкі глебы, але і для развіцця сельскагаспадарчай тэхнікі [10].

Шырокую вядомасць у беларускіх губернях мела эксперыментальнае поле пры Мар'іна-Горскай сельскагаспадарчай школе Ігуменскага павета Мінскай губерні, адкрытай у 1880 г. Глеба на полі – лёгкі суглінак, характэрны для наваколля. Мэта даследаванняў – вызначыць, якіх пажыўных рэчываў не хапае ў глебе і ў якіх памерах іх трэба ўносіць. Праводзіліся вопыты з распаўсюджанымі ў Беларусі культурамі: шведскім аўсом і бульбай. Авёс даў лепшыя вынікі па ўраджаі і даходнасці пры поўным угнаенні [14]. Па выніках эксперыментаў складаліся навуковыя даклады. Напрыклад, быў праведзены параўнальны аналіз дзейнасці вопытнай станцыі ў фальварку Мухаўка і вынікаў вопытаў Мар'іна-Горскай сельскагаспадарчай школы [15].

Адукацыйныя паслугі школы карысталіся попытам: у 1900 г. на 23 месцы ў навучальнай установе прэтэндавалі 100 абітурыентаў. У Мар'іна-Горскай сельскагаспадарчай школе былі адкрыты наступныя спецыяльнасці: араты, даглядчык, наглядчык над гаспадаркамі. Навакольныя памешчыкі і сяляне набывалі ў школе лепшыя гатункі насення, раслін і племянных жывёл па нізкім кошце, знаёміліся з культурай сельскай гаспадаркі. У школе, у тым ліку з удзелам МТСГ і прыцягненнем мясцовых сялян, была арганізавана выстава дасягненняў сельскай гаспадаркі, агляд навучальных дапаможнікаў. Дэманстравалася сельскагаспадарчая вытворчасць: выраб масла, ільнянога валакна, падрыхтоўка садавіны да сушкі [16]. Варта адзначыць, што поспехі школы былі адзначаны на выставе 1900 г. у Парыжы срэбным медалём, узнагародамі на ўсерасійскіх выставах [8].

На пасяджэннях агранамічнай секцыі МТСГ уздымалася пытанне аб заснаванні бюро па развіцці шматпольнай сістэмы. Член таварыства Я. Кавалеўскі крытыкаваў недастатковую работу аграрнай секцыі праз адсутнасць грашовых сродкаў [14].

Асобным кірункам дзейнасці МТСГ з пачатку яго існавання з'яўлялася інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі на частцы Палесся Мінскай губерні. Таварыства дапамагала ўраду, які прымаў захады да асушэння балот, на што было затрачана больш за 5 млн руб. У выніку асушылі звыш 400 тыс. дзесяцін зямлі. Дрэнаж і меліярацыя праводзіліся з мэтай паляпшэння агранамічнай культуры, падтрымкі сельскай гаспадаркі і эканомікі рэгіёна. Для садзейнічання эканамічнаму ўздыму Палесся МТСГ праводзіла агульныя сходы з прадстаўнікамі мясцовага насельніцтва ў Пінску і Мазыры, спрыяла адкрыццю ў Пінску Таварыства ўзаемнага крэдыту і Жаночага таварыства сельскай гаспадаркі. Спецыяльная камісія вывучала асаблівасці ўмоў асушкі, разглядала шляхі паляпшэння лугоў, сельскагаспадарчыя і эканамічныя пытанні. Таварыства звярталася да ўлады з прашэннем аб паляпшэнні Бярэзінскай воднай сістэмы [17].

Агранамічная секцыя прапаноўвала ўсталяваць на год фіксаваную таксу на інжынерныя, агранамічныя, меліярацыйныя работы, плату за асушку балот, нанясенне канаў на план. Перыядычны друк рэкламаваў названыя паслугі [18].

Досыць буйной з'яўлялася жывёлагадоўчая секцыя МТСГ. Паводле даных перыёдыкі малочная гаспадарка ў Мінскай губерні была развітай. Напрыклад, у 1903 г. гэта галіна прынесла прыбыткі наступнага памеру: у Мінскім павеце – 70 тыс. руб., Барысаўскім – больш за 25 тыс. руб., Ігуменскім – каля 20 тыс. руб., Навагрудскім – да 121 тыс. руб., Пінскім – да 25 тыс. руб. [19]. Аддзяленне жывёлагадоўлі МТСГ адкрыла ў Варшаве склад па збыце малочных прадуктаў, куды і пастаўляліся тавары ў адмыслова прыстасаваных вагонах з дапамогай Маскоўска-Брэсцкай і Прывісленскай чыгунак [20, с. 2]. З мэтай гуртавання пародзістых статкаў і паляпшэння мясцовай жывёлы таварыства набыло ў Фінляндыі некалькі галоў жывёлы мяшчэрскай пароды. Камісія з кампетэнтных у жывёлагадоўлі асоб аб'ехала жывёлагадоўчыя двары і ўнесла многія экзэмпляры племяннй скаціны ў радаводныя кнігі. Па запрашэнні таварыства ў жывёлагадоўчых гаспадарках Мінскай губерні працаваў інструктар малочнай вытворчасці [20]. Член МТСГ і практык Э. Л. Даманскіх, які ўкараняў новыя падыходы ў малочнай вытворчасці, падрыхтаваў навуковы даклад пра догляд жывёлы. Павелічэнне малочнасці кожнай каровы даследчык лічыў вынікам правільнага догляду і кармлення, што ўключала ў сябе наступныя ўмовы: утрыманне жывёлы ў цёплым памяшканні; забеспячэнне цёплага вадапою; размеркаванне вотруб'я штотыдзень на кожную карову прапарцыянальна памеру ўдою; выдача жывёлам адпаведнай порцыі солі, сухога вотруб'я і буракоў у цэлым выглядзе; правільнае адлучэнне цялят [21].

З мэтай высветліць аб'ектыўнае становішча жывёлагадоўлі і яе прыбытковасці секцыя разаслала апытальныя лісты сельскім гаспадарам. Атрыманыя адказы паслужылі матэрыялам для вывучэння стану жывёлагадоўлі ў Мінскай губерні [20].

Аддзяленне конегадоўлі ў 1900 г. вывучыла становішча 11 конскіх заводаў Міншчыны, у выніку чаго было зроблена заключэнне аб прадуктыўнасці распаўсюджвання ольдэнбургскай пароды коней. МТСГ вяло радаводныя кнігі парод, пры таварыстве працаваў ветэрынарны доктар [20].

Секцыя садаводства пры МТСГ распрацавала шэраг мер па развіцці садаводства і арганізацыі сушкі агародніны [22].

Шэраг аддзяленняў таварыства дзейнічаў з мэтай паляпшэння побыту сельскага насельніцтва. Пра неабходнасць работы ў гэтым напрамку пісаў таксама аўтар газеты «Kurjer Litewski», адзначаючы, што пры нізкім узроўні развіцця культуры адсутнічалі нават спробы «набыць сабе <...> штонебудзь прагрэсіўнае» [23]. Доктар З. Свяніцкі выступіў з ініцыятывай арганізацыі ў беларускіх губернях сельскагаспадарчых гурткоў, мэтай якіх было паляпшэнне становішча сялян. Перадавых вынікаў у гэтай сферы дасягнула Познанскае княства, у якім налічвалася 200 сялянскіх гурткоў. Прапаноўвалася пераняць гэты вопыт і іншым губерням [13; 14]. Таксама пры таварыстве было адкрыта бюро працы, значную ролю ў якім адыграў Я. Наркевіч-Ёдка. Навуковец падкрэсліў неабходнасць замежных камандзіровак рабочых для павышэння кваліфікацыі [15].

Пры МТСГ дзейнічала аддзяленне па паляпшэнні дробных гаспадарак, мясцовых і адыходных сялянскіх промыслаў. Меркавалася даследаваць стан гэтых гаспадарак, садзейнічаць іх развіццю. Таварыства працавала і ў галіне павышэння якасці медыцынскай дапамогі сельскаму насельніцтву [14].

Сістэматычна МТСГ выдавала папулярныя брашуры, арганізоўвала чытанні, лекцыі і конкурсы, набывала насенне, прылады працы і машыны, племянную жывёлу. Таварыства арганізавала збыт сельскагаспадарчых прадуктаў, адкрыла склады і крамы, узорныя майстэрні, ашчадныя і пенсійныя касы. Акрамя таго, МТСГ праводзіла выставы і кірмашы, запрашала на іх аграномаў і інструктараў. Пасяджэнні таварыства доўжыліся некалькі дзён. На працягу гэтага часу заслухоўваліся навуковыя даклады, справаздачы аб камандзіроўках і дзейнасці па секцыях.

Такую ж працу па прыкладзе МТСГ праводзіла і Віленскае таварыства сельскай гаспадаркі [24]. Матэрыялы прэсы сведчаць аб цесным супрацоўніцтве Мінскага і Віленскага таварыстваў сельскай гаспадаркі. Напрыклад, арганізацыі падрыхтавалі агульны зварот да ўлад аб вяртанні гандлёвых дзён

у гарадах і мястэчках на нядзелю (раней яны былі перанесены адміністрацыяй на будні з рэлігійных перакананняў, што было нявыгадна сялянам) [25]. МТСГ супрацоўнічала з Мінскім земляробчым таварыствам узаемнага страхавання і пазычыла яму 50 тыс. руб. Членам назіральнага камітэта з'яўляўся доктар З. Свянціцкі [25; 26]. Таксама ў Мінску было заснавана земляробчае таварыства ўзаемнага пазямельнага крэдыту [20].

Прэса адзначала неабходнасць развіцця крэдытавання як умовы эканамічнага прагрэсу сельскай гаспадаркі. Фінансавая палітыка, як сцвярджалі спецыялісты, павінна быць накіравана на змяншэнне крэдытнага працэнта, доўгатэрміновае і кароткатэрміновае крэдытаванне рамесніка, дробнага прамыслоўца, селяніна. У прэсе падкрэслівалася карысць дробнага крэдытавання (ад 100 да 1000 руб.) для развіцця гаспадаркі [27].

Найбольш відавочна ўзровень інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі дэманстраваўся на выставах. У Мінску з 26 жніўня па 4 верасня 1901 г. МТСГ з дазволу Міністэрства земляробства і дзяржаўнай маёмасці, атрыманага 29 сакавіка 1900 г., правяло сельскагаспадарчую і саматужна-прамысловую выставу ў гонар 25-годдзя сваёй дзейнасці. Яе мэтай было больш блізкае азнаямленне ўдзельнікаў і гасцей з поспехамі сельскай гаспадаркі і яе галін, прамысловасці і саматужнага промыслу, а таксама збліжэнне вытворцаў са спажыўцамі, стварэнне рынку для збыту і абмену прадуктамі. Выстава дзялілася на 12 галін і была прадстаўлена рознымі аддзеламі. Вылучаліся галіны паляводства і лугаводства з аддзеламі этнаграфічна-сельскагаспадарчай статыстыкі і арганізацыі; садоўніцтва, агародніцтва і кветкаводства; жывёлагадоўлі з аддзеламі рагатай жывёлы і малочнай гаспадаркі; конегадоўлі; разводкі дробных свойскіх жывёл з аддзеламі па відах жывёл, прадуктах жывёлагадоўлі; лесаводства; пчалярства і шаўкаводства, рыбалоўства і рыбаводства, палявання; спецыяльных сельскагаспадарчых культур і ўсяго, што звязана з прагрэсіўнасцю паляводства і лугаводства. Секцыя рамеснай і саматужнай вытворчасці ўключала апрацоўку мінералаў і металаў, раслінных прадуктаў і прадуктаў жывёлагадоўлі, розныя віды вытворчасці. Дзясятая галіна прадстаўляла сельскагаспадарчыя прылады, снарады, машыны, штучныя ўгнаенні і тукі. Асобна была арганізавана галіна фабрычнай і тэхнічнай вытворчасці, сельскагаспадарчай прамысловасці. Дванаццатую галіну прадстаўляла сельскагаспадарчае будаўніцтва [28; 29].

На выставу прымаліся экспанаты з Мінскай, Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Ковенскай, Гродзенскай, Валынскай, Кіеўскай, Смаленскай і Чарнігаўскай губерняў. Экспанаты з гэтых краёў удзельнічалі ў конкурсах і ўзнагароджваліся залатымі, сярэбранымі і бронзавымі медалямі, ганаровымі водгукамі, дыпломамі за лепшыя дасягненні ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці. Сялянскім экспанатам прысуджаліся грашовыя ўзнагароды. Падчас выставы былі арганізаваны навуковыя чытанні, выгул коней і жывёлы ў манеж. Прадстаўнікі іншых губерняў маглі прымаць удзел у выставе, але без права атрымліваць граматы і прэміі. У апошнія два дні выставы прайшоў аўкцыён экспанатаў, жывёл і г. д. Уладальнікам дазвалялася прадаваць экспанаты ва ўсе дні выставы па асабістай дамове з пакупнікамі. Прададзеныя прадметы павінны былі заставацца на выставе да яе закрыцця.

Падрыхтоўкай выставы займаўся распарадчы камітэт, які ўзначальваў К. Чапскі. На працягу года ён акумуляваў субсідыі, лес для пабудовы павільёнаў. У паветы дэлегаваліся прадстаўнікі камітэта для распаўсюджвання інфармацыі пра выставу, падбору экспанатаў. Дасканала была наладжана праца з экспанентамі: заключалася пагадненне, паводле якога яны павінны былі прывесці пералік прадметаў, якія будуць выстаўляцца, выбраць месца ў закрытым або адкрытым павільёне, авансам аплаціць 25 % кошту выставачнага месца. Плата за квадратны аршын у адкрытым павільёне складала 25 капеек, у закрытым – 1 руб. за фут [28]. Экспаненты, якія жадалі мець свае вітрыны, дэкарыравалі іх самі па малюнках, ухваленых камітэтам. Акрамя таго, камітэт з'яўляўся пасрэднікам па страхаванні маёмасці ўдзельнікаў [30].

Вялікае значэнне мела выстава для навуковага вывучэння сельскай гаспадаркі беларускіх губерняў. Збіраліся звесткі пра харчаванне, вопратку, стан жылля, земляробства і промыслаў, асветы і маральнага развіцця дробных гаспадароў. Апытальныя лісты былі разасланы па губернях, аднак Магілёўская, Гродзенская, Віцебская губерні адказвалі на іх неактыўна. На падставе анкет і статыстычных даных складаліся табліцы і графікі аб становішчы сялян і дробных гаспадароў у эканамічным і культурным аспектах. Доктар Малькевіч працаваў над табліцамі па санітарным становішчы сельскага насельніцтва. Паралельна адбываўся збор узораў саматужных вырабаў у этнаграфічныя калекцыі, якія пасля выставы змяшчаліся ў заснаваны МТСГ сельскагаспадарча-этнаграфічны музей [13]. Газеты заахвочвалі земляробаў да шырокага ўдзелу ў выставе [28].

Як адзначаў Э. Вайніловіч, сельскагаспадарчая выстава была дэманстрацыяй сіл Паўночна-Заходняга краю [11, с. 99–103]. Праца таварыства прызнавалася ў СМІ паспяховай і мэтазгоднай [28–30].

Дзейнасць таварыства пераадолела шмат праблем, якія перашкаджалі развіццю сельскай гаспадаркі. Члены таварыства дамагліся значных ільгот, увялі розныя ўдасканаленні ў сельскагаспадарчую тэхніку, істотна паднялі сельскагаспадарчую прамысловасць беларускіх губерняў.

Вялікія спадзяванні ў сферы сельскай гаспадаркі ліберальныя дзеячы звязвалі з развіццём самакіравання. Грамадская самадзейнасць павінна была забяспечыць прагрэс у гаспадарчым і эканамічным развіцці Беларусі, укараненні новых спосабаў гаспадарання, адкрыцці агранамічных школ, удасканаленні сельскіх промыслаў і арганізацыі збыту прадукцыі, садзейнічаць актыўнасці сельскагаспадарчых аб'яднанняў. У задачы працы земскіх устаноў уваходзілі таксама паляпшэнне медыцынскай дапамогі насельніцтву, наём дактароў і адкрыццё сельскіх аптэк, школ і выданне літаратуры.

## Заключэнне

Такім чынам, лакаматывам арганізацыі гаспадарання па інтэнсіўным шляху ў канцы XIX – пачатку XX ст. з'яўляліся сельскагаспадарчыя таварыствы. Найбольш актыўнай і плённай была праца МТСГ, якое дзейнічала па ўсіх галінах вытворчасці і арганізацыі быту сельскіх гаспадароў. Сярод кірункаў інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі Беларусі вызначыліся фарміраванне галін сельскагаспадарчай вытворчасці і навуковы падыход да іх развіцця, арганізацыя і функцыянаванне даследчых станцый і дэманстратыўных устаноў. Развіццю прагрэсіўных падыходаў вядзення гаспадаркі і перадавых дасягненняў у сферы земляробства, жывёлагадоўлі, садоўніцтва, пчалярства, лугаводства і іншых галінах вытворчасці спрыяла праведзеная ў 1901 г. у Мінску сельскагаспадарчая і саматужна-прамысловая выстава.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Аграрный вопрос: доклад Г. И. Свентицкого Минскому сельскохозяйственному обществу 5 марта 1906 г. СПб., 1906.
2. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён : у 3 т. Мінск, 2002. Т. 2 : Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгаўз [і інш.] ; пад рэд. В. П. Панюціча.
3. *Райзберг Б. А., Лозовский Л. Ш.* Интенсификация // Словарь современных экономических терминов. 4-е изд. М., 2008. С. 133.
4. *Кожушков А. И.* Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX века : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 1963.
5. *Липинский Л. П.* Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.) / ред. Т. Е. Солодков. Минск, 1971.
6. Экономика Белоруссии в эпоху империализма 1900–1917 / М. Г. Матусевич [и др.] ; под ред. Г. Т. Ковалевского [и др.]. Минск, 1963.
7. *Жытко А. П.* Мадэрнізацыя памешчыцкай гаспадаркі Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.). // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2009. Вып. 4. С. 3–12.
8. *Киштымов А. Л.* Беларусь на выставках XIX – начала XX в. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 2001.
9. *Марченко Т. Н.* Подготовка кадров для сельского хозяйства в Беларуси (конец XVIII – начало XX века) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 2016.
10. Из области сельского хозяйства. Ч. I // Белорус. вестн. 1904. 24 нояб. (№ 4). С. 4.
11. *Войнилович Э.* Воспоминания. Минск, 2007.
12. Из области сельского хозяйства. Ч. II // Белорус. вестн. 1904. 29 нояб. (№ 9). С. 3.
13. Улучшение мелких хозяйств // Минский листок. 1900. 3 дек. (№ 145). С. 2–3.
14. Общее собрание членов минского общества // Минский листок. 1900. 12 дек. (№ 149). С. 2.
15. В обществе сельского хозяйства // Белорус. вестн. 1904. 9 дек. (№ 4). С. 3.
16. Марьино-Горская сельскохозяйственная школа // Минский листок. 1900. 3 окт. (№ 119). С. 2.
17. Минское полесье // Минский листок. 1900. 12 дек. (№ 149). С. 2.
18. Prywatne biuro meljoraoyjne // Kurjer Litewski. 1905. 28 września. S. 4.
19. Молочное хозяйство // Белорус. вестн. 1904. 2 дек. (№ 12). С. 3.
20. К деятельности общества сельских хозяев // Минский листок. 1900. 12 окт. (№ 123). С. 1–2.
21. Как увеличить молочность коровы? // Белорус. вестн. 1904. 7 дек. (№ 17). С. 3.
22. Меры по поднятию садоводства // Минский листок. 1900. 29 окт. (№ 130). С. 2.
23. *Ostroróg-Sadowski J.* Uprzemysłowienie Litwy // Kurjer Litewski. 1905. 1 wrzesnia. S. 2.
24. Улучшение мелких хозяйств // Минский листок. 1900. 5 нояб. (№ 133). С. 3.
25. Общее собрание Минского общества сельского хозяйства // Минский листок. 1900. 22 окт. (№ 127). С. 2–3.
26. Новое страховое общество // Минский листок. 1900. 16 янв. (№ 7). С. 3.
27. O drobny kredyt // Kurjer Litewski. 1905. 11 września. S. 3.
28. Выставка сельского хозяйства // Минский листок. 1900. 1 окт. (№ 118). С. 2.
29. Могилёв, 17 января // Могилёв. губерн. ведомости. 1901. 17 янв. (№ 5). С. 1.
30. Выставка // Минский листок. 1900. 28 нояб. (№ 143). С. 2.

## References

1. Agrarnyi vopros: doklad G. I. Sventitskogo Minskomu sel'skokhozyaistvennomu obshchestvu 5 marta 1906 g. [The agrarian question. Report G. I. Sventitsky for Minsk Agricultural Society. March 5, 1906]. Saint Petersburg, 1906 (in Russ.).
2. Gistoryja sjaljanstva Belarusi sa starazhytnyh chasow da nashyh dzjon [The history of the peasantry of Belarus from ancient times to the present day] : in 3 vol. Minsk, 2002. Vol. 2 : Gistoryja sjaljanstva Belarusi ad rjeformy 1861 g. da sakavika 1917 g. [History of Belarus peasantry by the reform of 1861 until March 1917] (in Belarus.).

3. Rajzberg B. A. Intensifikatsiya [Intensification]. *Slovar' sovremennykh ehkonomicheskikh terminov*. Moscow, 2008. P. 133 (in Russ.).

4. Kozhushkov A. I. Razvitie kapitalizma v sel'skom khozyaistve Belorussii vo vtoroi polovine XIX veka [The development of capitalism in agriculture of Belarus in the second half of the XIX century] : avtoreferat dissertatsii… kandidata istoricheskikh nauk : 07.00.02. Minsk, 1963 (in Russ.).

5. Lipinskij L. P. Razvitie kapitalizma v sel'skom khozyaistve Belorussii (II polovina XIX v.) [The development of capitalism in agriculture of Belarus (II half of XIX century)]. Minsk, 1971 (in Russ.).

6. Matusevich M. G. Ekonomika Belorussii v epokhu imperializma 1900–1917 [Economy of Belarus in the epoch of imperialism 1900–1917]. Minsk, 1963 (in Russ.).

7. Zhytko A. P. Madjernizacyja pameshchyckaj gaspadarki Belarusi (drugaja palova XIX – pachatak XX st.) [Modernization of the landlord economy of Belarus (second half of XIX – early XX century)]. *Pratsy gistarychnaga fakul'teta BDU* : navuk. zb. Minsk, 2009. Vol. 4. P. 3–12 (in Belarus.).

8. Kishtymov A. L. Belarus' na vystavkakh XIX – nachala XX v. [Belarus exhibitions XIX – beginning of XX century] : avtoreferat dissertatsii… kandidata istoricheskikh nauk : 07.00.02. Minsk, 2002 (in Russ.).

9. Marchenko T. N. Podgotovka kadrov dlya sel'skogo khozyaistva v Belarusi (konets XVIII – nachalo XX veka) [Training for agriculture in Belarus (the end of XVIII – beginning of XX century)] : avtoreferat dissertatsii… kandidata istoricheskikh nauk : 07.00.02. Minsk, 2016 (in Russ.).

10. Iz oblasti sel'skogo khozyaistva : chast' I [From the field of agriculture : part I]. *Beloruss. vestnik*. 1904. 24 Novemb. (No. 4). P. 4 (in Russ.).

11. Voynilovich E. Vospominaniya [Memories]. Minsk, 2007 (in Russ.).

12. Iz oblasti sel'skogo khozyaistva : chast' II [From the field of agriculture : part II]. *Beloruss. vestnik*. 1904. 29 Novemb. (No. 9). P. 3 (in Russ.).

13. Uluchshenie melkikh khozyaistv [Improvement of small farms]. *Minsk. listok*. 1900. 3 Dec. (No. 145). P. 2–3 (in Russ.).

14. Obshchee sobranie chlenov minskogo obshchestva [The general meeting of the Minsk Society of Agriculture]. *Minsk. listok*. 1900. 12 Dec. (No. 149). P. 2 (in Russ.).

15. V obshchestve sel'skogo khozyaistva [In agriculture society]. *Beloruss. vestnik*. 1904. 9 Dec. (No. 4). P. 3 (in Russ.).

16. Mar'ino-Gorskaya sel'skokhozyaistvennaya shkola [Maryina Horka agriculture school]. *Minsk. listok*. 1900. 3 Oct. (No. 119). P. 2 (in Russ.).

17. Minskoe poles'e [Minsk Polesia]. *Minsk. listok*. 1900. 12 Dec. (No. 149). P. 2 (in Russ.).

18. Prywatne biuro meljoraoyjne [Private office of melioration]. *Kurjer Litewski*. 1905. 28 Sept. P. 4 (in Pol.).

19. Molochnoe khozyaistvo [Dairying]. *Beloruss. vestnik.* 1904. 2 Dec. (No. 12). P. 3 (in Russ.).

20. K deyatel'nosti obshchestva sel'skikh khozyaev [Activities farmers society]. *Minsk. listok*. 1900. 12 Oct. (No. 123). P. 1–2 (in Russ.).

21. Kak uvelichit' molochnost' korovy? [How to increase milk yield of cows?]. *Beloruss. vestnik*. 1904. 7 Dec. (No. 17). P. 3 (in Russ.).

22. Mery po podnyatiyu sadovodstva [Measures to gardening raising]. *Minsk. listok*. 1900. 29 Oct. (No. 130). P. 2 (in Russ.).

23. Ostrorog-Sadowski J. Uprzemysłowienie Litwy [Industrialization of Lithuania]. *Kurjer Litewski.* 1905. 1 Sept. P. 2 (in Pol.).

24. Uluchshenie melkikh khozyaistv [Improvement of small farms]. *Minsk. listok*. 1900. 5 Novemb. (No. 133). P. 3 (in Russ.).

25. Obshchee sobranie Minskogo obshchestva sel'skogo khozyaistva [The general meeting of the Minsk Society of Agriculture]. *Minsk. listok*. 1900. 22 Oct. (No. 127). P. 2–3 (in Russ.).

26. Novoe strakhovoe obshchestvo [New insurance company]. *Minsk. listok*. 1900. 12 January (No. 7). P. 3 (in Russ.).

27. O drobny kredyt [About small loan]. *Kurjer Litewski*. 1905. 11 Sept. P. 3 (in Pol.).

28. Vystavka sel'skogo khozyaistva [Exhibition of Agriculture]. *Minsk. listok*. 1900. 1 Oct. (No. 118). P. 2 (in Russ.).

29. Mogilev, 17 yanvarya [Mogilev, 17 January]. *Mogilev. gubernskie vedomosti.* 1901. 17 January (No. 5). P. 1 (in Russ.).

30. Vystavka [Exhibition]. *Minsk. listok*. 1900. 28 Novemb. (No. 143). P. 2 (in Russ.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 30.11.2016.*
*Received by editorial board 30.11.2016.*